**Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918-1941):** Хрэстаматыя для студэнтаў філал. фак.: У 2 ч. / Аўт.-уклад. С.М. Запрудскі, Г.І. Кулеш. Мн.: БДУ, 2005. Ч. 1. 213 с.

Выхад вучэбнага дапаможніка «Гісторыя беларускага мовазнаўства» засведчыў няспынны працэс развіцця лінгвістычнай думкі, дыферэнцыяцыі філалагічнай навукі. Сама дысцыпліна «гісторыя беларускага мовазнаўства» з'яўляецца, безумоўна, важнай і актуальней, дазваляе сістэматызаваць веды студэнтаў. Гэта дасягаецца дзякуючы таму, што здабытыя на папярэдніх курсах прыватныя веды і палажэнні разглядаюцца з боку іх храналагічнага станаўлення, у неад'емнай сувязі з асобамі тых, хто гэтым займаўся. Ніводная навука не існуе без сваіх «стваральнікаў», нават пры тым, што канкрэтныя палажэнні асобных з іх з цягам часу могуць станавіцца неактуальнымі і нават пачынаюць лічыцца памылковымі. Але, як вядома, трывалыя, сапраўдныя, сталыя навуковыя веды і здабываюцца падчас дыскусійных пошукаў. І абмінаць увагай асоб, што займаліся пошукамі, не цікавіцца шляхамі, па якіх «блукала» навуковая думка, перш чым трапіць у якасці аксіёмы на старонкі падручнікаў, - значыць, свядома абмяжоўваць сваю адукацыю і кругагляд, а ў маральным сэнсе - без удзячнасці і павагі праігнараваць жыццё і дзейнасць навукоўцаў.

Асаблівую актуальнасць для любой навукі маюць складаныя, неадназначныя ў гістарычным і палітычных планах часы яе развіцця і станаўлення. Для беларускага мовазнаўства адным з такіх складаных і адначасова вынікковых быў так званы «міжваенны час» - з 1918 па 1941 г. Агульнавядома, што гэта час супярэчлівых пошукаў, каштоўных здабыткаў і неапраўданых страт, час, калі навуковыя распрацоўкі вяліся па розных кірунках, абумоўленых, акрамя аб'ектыўных законаў развіцця навукі, яшчэ і палярнымі зменамі палітычных вектараў.

Вернутая ў 1918 г. у афіцыйны ўжытак пасля працяглага ігнаравання і ўціску беларуская мова не магла ў сваім стане на той момант спраўна функцыяніраваць ва ўсіх сферах жыцця з-за сваёй скалечанасці ў галіне правапісу, граматыкі, лексікалогіі, тэрміналогіі. Палепшыць сітуацыю ўзяліся шматлікія навуковыя і грамадскія дзеячы. Асноўныя кірункі, па якіх вялася работа, абумовілі структуру вучэбнага дапаможніка, які складаецца з пяці раздзелаў: І. Распрацоўка беларускай навуковай тэрміналогіі; ІІ. Дзейнасць у галіне лексікаграфіі; ІІІ. Распрацоўка правапісу ў 1920-я гг.; IV. Усталяванне граматычных нормаў; V. Выпрацоўка канцэпцыі фарміравання літаратурнай мовы.

Матэрыялы для кожнага з пяці раздзелаў выбіраліся не выпадкова, а з выдатным веданием тагачаснай моўна-палітычнай сітуацыі і з улікам вучэбнай праграмы і ўласнага выкладчыцкага вопыту аўтараў-укладальнікаў. Дацэнт С.М. Запрудскі займаецца пытаннямі гісторыі беларускага і славянскага мовазнаўства, моўнай палітыкі, рэфармавання ў сістэме правапісу, мае шматлікія публікацыі, прысвечаныя вядомым мовазнаўцам мінулага і сучаснасці, а таксама звязаныя з асаблівасцямі развіцця беларускай мовы на розных этапах, асабліва ў 20-я і 30-я гг. мінулага стагоддзя, распрацаваў І чытае на філалагічным факультэце спецыяльны курс лекцый «Гісторыя беларускага мовазнаўства 1918-1941 гг.» і выкладае «Гісторыю беларускага мовазнаўства». У коле навуковых інтарэсаў і пошукаў дацэнта Г.І. Кулеш - праблемы гістарычнай І сучаснай лексікалогіі, пытанні культуры мовы, шмат публікацый даследчыца прысвяціла праблеме фарміравання беларускай літаратурнай мовы ў 20-30-я гг. XX ст., ролі асобных пісьменнікаў і мовазнаўцаў таго часу.

Як адзначана ў прадмове да выдання, змест кожнага раздзела складаюць пера важна малавядомыя і маладаступныя публікацыі, што характарызуюць розныя напрамкі мовазнаўчых пошукаў. У адрозненне ад хрэстаматый па іншых дысцыплінах, дзе яны з'яўляюцца «сухім» зборам тэкстаў і дадаткам да адпаведнага падручніка, без якога нярэдка не могуць быць зразумелымі і выкарыстанымі, хрэстаматыя «Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918-1941)» у пэўнай ступені можа лічыцца самастойным выданнем. Аўтарыўкладальнікі дасягнулі гэтага дзякуючы таму, што ў пачатку кожнага раздзела змясцілі ўводны артыкул, у якім акрэслілі асноўныя кірункі дзейнасці па пэўным пытанні і невялікія каментарыі да тэкстаў, прапанаваных для вывучэння і аналізу. Перад кожным аўтарскім тэкстам вельмі дарэчы падаюцца звесткі (часам раней не вядомыя шырокаму колу) з біяграфіі і прафесійнай дзейнасці саміх аўтараў. Да таго ж нярэдка ў хрэстаматыі сустракаюцца спасылкі-каментарыі, звязаныя з арыгінальнай публікацыяй пэўных матэрыялаў, што дазваляе захаваць іх дакументальную дакладнасць і павышае навуковую каштоўнасць вучэбнага дапаможніка.

Навуковую вартасць вучэбнаму дапаможніку надае і тое, што тэксты арыгінальных дакументаў, змешчаных у трэцім і чацвёртым раздзелах, дазваляюць убачыць адсутнасць адзіных правапісных і граматычных стандартаў.

Хрэстаматыя «Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918-1941)» лагічна дапаўняе і ілюструе адпаведныя раздзелы падручніка «Гісторыя беларускага мовазнаўства» Л.М. Шакуна, дапаможніка «Гісторыя беларускага мовазнаўства» Т.І. Тамашэвіча, паказвае ўсю складанасць працэсаў, якія адбываліся ў беларускай мове на «пераломным», «крызісным» этапе яе станаўлення. Хрэстаматыя, безумоўна, будзе садзейнічаць больш глыбокаму разуменню студэнтамі лінгвістычных праблем і засваенню ведаў, прадугледжаных вучэбнай прафамай.

Непасрэднае знаёмства з дакументамі і працамі любога перыяду спрыяе больш поўнаму разуменню іх зместу і асэнсаванню значэння гістарычнага этапа і ролі асобы ў ім. Такую магчымасць і дае студэнтам і ўсім, хто цікавіцца беларускай мовай, вучэбны дапаможнік «Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918-1941)», з'яўленне якога ў кнігарнях і бібліятэках можна толькі вітаць.

***А.В. Губкіна,***
кафедра гісторыі беларускай мовы